УДК 392.51 (476.2 -37)

*А. Л. Дубравец*

# УДЗЕЛ ДЗЯЦЕЙ У СУЧАСНАЙ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ Ў ЛЕЛЬЧЫЦКІМ РАЁНЕ

*Артыкул пабудаваны на фальклорна-этанаграфічных матэрыялах Лельчыцкага раёну, сабраных пад час палявых экспедыцый за перыяд 2010–2013 гг. Аўтар паказвае асноўныя мясцовыя абрады і звычаі вяселля, якія нельга б было б правесці без удзелу ў іх дзяцей і падлеткаў. Даследаванне акцэнтуе ўвагу на ролі сучасных дзяцей у абрадавым вясельным комплексе.*

Беларускае вяселле як урачыстае мерапрыемства прадугледжвае важлівую ролю не толькі для дарослых, але і для дзяцей. Такія айчынныя этнографы як Л. В. Ракава, А. Дз. Якубінская ў сваіх працах, прысведчаных вывучэнню свету дзяцінства, побыту падрастаючага пакалення паказалі, што правядзенне некаторых вясельных святкаванняў без іх немагчымы. «Дзеці прыносяць шчасце» [1, с. 99], таму і ўдзел іх у вясельных абрадах і звычаях лічыўся не толькі пажаданым, але і неабходным, што было звязана з верай сялян у іх звышнатуральную магчымасць становуча ўплываць на святы, звязаныя з пачаткам ці нараджэннем новай сям’і [2, с. 99].

Прыцягненне дзяцей да сямейнай абраднасці было характэрна як для традыцыйнай культуры беларусаў, так і для сучаснаснай. З гэтай прычыны цікава даследаваць, якую ролю адыгрываюць дзеці і падлеткі ў сучаснай вясельнай абраднасці Лельчыцкага раёна.

Асноўнай крыніцавай базай паслужыла этнаграфічнае даследаванне, праведзенае у розных вёсках Лельчыцкага раёна за перыяд 2010–2013 гг. З дапамогай інтэрв’ю, анкетавання насельніцтва, вуснымі бяседамі і уласнымі назіраннямі. Метадам інтэрв’ю былі апытаны мужчыны і жанчыны (35 чалавек),рэспандэнты самага рознага ўзросту (ад 18 да 85 гадоў). Метадам анкетавання было апытана 50 дзяцей – 30 дзяўчынак і 20 хлопчыкаў ва ўзросце ад 10 да 17 гадоў. Усе рэспандэнты з’яўляюцца карэннымі жыхарамі Лельчыцкага раёна.

Сабраны матэрыял дазволіў вызначыць уклад дзяцей у сучасную вясельную абраднасць, якая ў Лельчыкім раёне ў асноўным адбываецца напрацягу трох дзён. Першы дзень праходзіць у хаце маладой, на другі дзень госці збіраюцца ў хаце маладога, а трэці дзень, які звычайна называюць «Куры», праходзіць або ж у хаце маладой, ці маладога, або ж у двух хатах адначасова, толькі з тымі гасцямі, які кожны бок запрашаў.

Роля дзяцей і падлеткаў у такіх святкаваннях нязначная, калі параўноўваць з гэтым удзел іншых дарослых асоб. Але ж па сённяшні час існуюць такія абрадавыя дзеянні, у большасці жартоўныя, якія немагчыма ўявіць без прысутнасці дзяцей. Да абрадавых дзеяў апытаныя рэспандэнты аднеслі наступныя: абрад выкупу месца жаніха каля нявесты пад час святкавання вяселля ў хаце маладой, так званыя «Куры», якія шырока распаўсюджаны ў Лельчыцкім раёне.

Выкуп жаніхом месца каля нявесты праводзіцца ў першы дзень святкавання. Звычайна дзеля правядзення абраду выбіраюць хлопчыка гадоў 10–16. Галоўная умова – быць гаваркім і нічога не баяцца. Калі ў нявесты няма такого ўзросту роднага брату, то выбіраюць хлопчыка з стрыечных сваякоў. Па шматлікіх сведчаннях мясцовых жыхароў гэты абрад мае карані ў глыбокім мінулым. Напрыклад, вось такія сведчанні прыводзіла самая старэйшая апытаная рэспандэнтка, 1928 года нараджэння, карэнная жыхарка в. Глушкавічы Лельчыцкага раёну – Паліна Філіпаўна Філанавец: «Знаю, што гэта даўні

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

звычай, бо на маім вяселлі ён быў і на вяселлі маёй маці». Канешне, да нашага часу гэтае абрадавае дзеянне ўжо змянілася, але ж галоўным засталася сутнасць, якая заключаецца ў тым, каб патаргавацца малодшаму брату нявесты з жаніхом за месца каля маладой.

Пасля таго, як маладыя афіцыйна сталі мужам і жонкай, нявесту з яе дружкамі прывозяць да хаты, дзе святкуецца першым вечарам вяселле, а жаніх і яго дружына адпраўляюцца за гасцямі з сваёй стараны. Тады ж у хаце нявесты праходзіць наступнае: з аднаго боку, малодшы брат маладой, які будзе потым прадаваць месца маладому, і нявеста трымаюцца за рукі, а хросныя бацькі абвязваюць іх рукі ручніком (у асобных вёсках ручніком не абматваюць), а з другога нявесту трымае за руку яе дружка. Так яны ўсе разам адпраўляюцца да святочнага сталу. Утрох, трымаясь за рукі, тры разы пад малітву абходзяць стол і сядаюць так каб малодшы брат нявесты сеў на месца маладога і чакаюць сватоў.

Па прыездзе жаніха з гасцямі, пачынаецца жартоўная спрэчка паміж малодшым братам і жаніхом. Жартоўны спор у асноўны заключаны ў тым, што жаніх за места дае мала грошай. Тады ж пачынаюць з абсмяяння скупасці і жаднасці маладога. Брат нявесты таксама пачынае спрачацца і давадзіць жаніху, што за такія грошы і ў магазін за хлебам не сходзішь і такая прыгожая нявеста расла ў сям'і, а ён не цэніць. Вось прыклад, які прывадзіў Дзмітрый Мікалаевіч Бурлевіч: «Ён ложыць 100 тысяч беларускіх рублёў, а я кажу, што банцік на галаве нявесты столькі не стоіць, што нейкі бедны жаніх нам дастаўся і трэба падумаць, каму ж мы аддаем сваю сястру». Усё заканчваецца тым, што жартоўная спрэчка сціхае, бакі дагаварыліся, малодшы брат нявесты палучае выкуп і ўступае месца маладому.

Ёсць яшчэ адзін цікавы жартоўны звычай, які патрабуе абавязковага ўдзелу дзяцей і падлеткаў у Лельчыцкім раёне. Па звестках мясцовых жыхароў, абрад «Куры», які адбываецца на трэці дзень вяселля (або ж па другому называюць «Петухі»,) укараніўся ў вясельную абраднасць Лельчыцкага краю ў 1990-я гг. Сутнасць «Курэй», заключаецца ў тым, што самыя блізкія сваякі, суседзі, знаёмыя і сябры прыходзячы да гаспадароў на трэці дзень вяселля, бліжэй да другой паловы дня, пачынаюць прымаюць самыя розныя жартоўныя вобразы (урача, цыганкі, бабы, дзеда і жаніха з нявестай і г. д.). Пераапранутыя жаніх і нявеста павінны быць абавязкова. Жаніхом становіцца жанчына, а нявестай – мужчына, ці часцей падлетак. Што датычыцца дзяцей, то пераапранаюцца ўсе па жаданню і ў таго, каго самі захочуць, як кажуць у народзе: «Чым больш людзей, тым і лепей». Але ж удзельнічаюць у гэтай жартоўнай гульні ў большасці падлеткі. Галоўная ўмова – быць у вясёлым настроі і гаваркім.

Паралельна з гэтым, удзельнікі рыхтуюць ўпрыгожваюць каня з вазом. Калі людзі пераапрануліся, то збіраюцца і сядаюць напавозку. Потым гэтая кампанія раз'язже па вёсцы з песнямі. Яны могуць заехаць у любы двор сваякоў ці са стараны жаніха, ці са стараны нявесты і там ловяць курэй сколькі зможуць – вось для гэтага збольшу і патрэбны падлеткі, ад чаго ўласна пайшла і назва.

Яшчэ адной аметнасцю вяселля ў Лельчыцкім раёне з'яўляецца наяўнасць «Свяцілкі». «Свяцілкай выбіраюць дзяўчынку гадоў 10–16, якая павінна быць роднай або стрыечнай сястрой маладога». Рэспандэнты сведчылі, што на свяце яе параўноўваюць з анёлам, бо яна як бы служыць пасрэднікам з Богам, сімвалізуе – дабрату, свет. Галоўная яе задача ўсюды быць каля жаніха і прыкрываць рукой яго спіну, дзе вісіць прышпіленая іголка з чырвонай ніткай. Ужо сведчанні апытаных, для чаго патрэбна іголка з ніткай – супярэчлівыя. Адны лічаць, што маладому прышпільваюць яе дзел таго, каб на вяселлі не сурочылі. Былі і іншыя меркаванні, якія адносілі іголку з ніткай да нейкага сімвалу, які сімвалізуе шматдзетнасць, багацце, шчаслівае жыццё ў шлюбе, а значыць роль «Свяцілкі» ў тым, каб яна прыкрывала рукой іголку і сачыла за тым, каб ніхто яе не ўкраў. Па словах рэспандэнткі Анастасіі Сцяпанаўны Бурым, у сучаснасці існуе, хаця непаўсюдна, такі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жартоўны звычай, калі маладыя хлопцы маглі ўкрасці гэтую іголку, а потым жартоўна пасмяяцца над «Сваціілкай», чаму ж яна так пагана сочыць за жаніхом.

Такім чынам, хоць роля дзяцей і падлеткаў на вяселлі другарадная, але ж усё ж такі іх уздел надае святу тую рэгіянальную адметнасць, урачыстаць і каларыт, што захоўваюццазараз і будуць мець працяг у будучым.

**Літаратура**

1 Ракава, Л. В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава.– Мн.: Ураджай. – 2000. – 111 с.

2 Якубінская, А. Дз. Традыцыйная сацыялізацыя дзяцей беларускіх сялян у другой палове 10 – першай палове 20 ст. / А. Дз. Якубінская. – Мн.: РІВШ, 2010. – 118 с.

**УДК: 343.14:347.965**

***О. В. Евлаш, И. Н. Цыкунова***

## О ПРАВЕ АДВОКАТА-ЗАЩИТНИКА СОБИРАТЬ СВЕДЕНИЯ И ПРЕДСТАВЛЯТЬ ДОКАЗАТЕЛЬСТВА

*Статья посвящена исследованию реализации права адвоката-защитника собирать сведения и представлять доказательства на стадии предварительного расследования по уголовным делам. Процедура собирания защитником доказательств уголовно-процессуальным законодательством республики беларусь не регламентирована. Поэтому особое внимание уделено рассмотрению способов собирания адвокатом сведений, могущих иметь значение доказательств. Для более полной реализации защитником права на участие в собирании доказательств предлагается внести изменения и дополнения в ч. 3 ст. 103, п. 10 ч.1 ст. 48 уголовно-процессуального кодекса республики Беларусь.*

Согласно п.п. 9, 10 ч. 1 ст.48 Уголовно-процессуального кодекса Республики Беларусь 1999 г. [1] (далее – УПК) защитнику предоставляется право представлять доказательства; собирать по своей инициативе сведения, относящиеся к обстоятельствам совершенного преступления, и представлять их органу дознания, лицу, производящему дознание, следователю, суду, участвовать в следственных действиях, проводимых в связи с представлением названных сведений.

Порядок получения доказательств регламентирован ст. 103 УПК. В соответствии с ч.1 этой статьи собирание доказательств производится в процессе разрешения заявлений и сообщений о преступлении, ускоренного производства, дознания, предварительного следствия и судебного разбирательства путем проведения допросов, очных ставок, предъявления для опознания, выемки, обысков, осмотров, следственных экспериментов, производства экспертиз и других процессуальных действий.

При этом в силу ч. 2 названой статьи право вызвать любое лицо для проведения следственных и других процессуальных действий или дачи заключения в качестве эксперта; производить осмотры, обыски и другие предусмотренные УПК следственные действия; требовать от предприятий, учреждений, организаций, объединений, должностных лиц и граждан, а также органов, осуществляющих оперативно-розыскную деятельность, представления предметов и документов, имеющих значение для уголовного дела; требовать производства ревизий и проверок от соответствующих органов и

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ